# МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВІКІПЕДЫІ

*Бяляцкі Яўгені*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – магістр філ. навук*

Быў праведзены кантэнт-аналіз дзвюх беларускіх Вікіпедый, арыентаваных на розныя стандарты сучасных літаратурных норм. Разглядаліся артыкулы, звязаныя з праграмаваннем, каб праверыць тэматычную разнаснастайнасць прафесійнай лексікі. Сабраны адпаведны корпус моўных фактаў. Выяўлена меншая інфарматыўнасць беларускіх версій у параўнанні з рускамоўнай Вікіпедыяй. Але паказальны сам факт запатрабаванасці беларускай мовы ў розных сферах і яе варыянтнасці, што сведчыць пра жыццяздольнасць беларускай нацыянальнай мовы.

Вікіпедыя – агульнадаступная шматмоўная ўніверсальная інтэрнэт-энцыклапедыя са свабодным кантэнтам, рэалізаваная на прынцыпах вікі. З улікам асаблівасці згаданага падыходу можна сцвярджаць, што наяўнасць featнатэматычных артыкулаў на пэўнай мове – сведчанне яе запатрабаванасці і жыццяздатнасці. Разглядаючы дзве версіі беларускай Вікіпедыі, не можам не заўважыць першапачатковае адрозненне, якое адлюстравана ў спасылках на гэтыя два розныя сайты: be.m.wikipedia.org і be-tarask.m.wikipedia.org. Інфармацыя з другога сайта пададзена на тарашкевіцы. Але пры гэтым адным з першых адказаў на любы запыт будзе спасылка на рускамоўную версію.

Самая вялікая праблема абедзвюх версій беларускай Вікіпедыі тое, што адной крыніцы інфармацыі менш, а ў другой яе значна менш. Такія назіранні пацвярджаюцца прыкладамі аналізу артыкулаў, прысвечаных праграмаванню.

Разгледзім артыкул аб мове праграмавання *асэмблер*. У рускай версіі карыстальнік знаёміцца з самім працэсам асэмблявання, тады як у абедзвюх беларускіх версіях Вікіпедыі дадзеная інфармацыя адсутнічае. Пра саму мову даецца меншая колькасць інфармацыі на Вікіпэдыі, чым на Вікіпедыі, аднак асноўная інфармацыя аб мове прадстаўлена на абодвух сайтах. Аналагічна і з іншымі артыкуламі (*аб’ектна-арыентаванае праграмаванне*; *праграмнае забеспячэнне*), магчыма адсутнасць артыкула ў адной з версій або фактычная недакладнасць (*аперацыйная сістэма* на Вікіпэдыі).

Звычайна чалавек успрымае энцыклапедыю як крыніцу дакладнай інфармацыі, у тым ліку і лінгвістычнай. У сувязі з гэтым беларускія анлайн-энцыклапедыі 1) могуць не забяспечыць дастатковай колькасцю інфармацыі, таму давядзецца звяртацца да рускамоўнай ці якой іншай версіі; 2) патрабуюць ад карыстальніка лінгвістычных ведаў пра асаблівасці станаўлення і функцыянавання літаратурный нормы беларускай мовы, каб карэктна і маўленча дакладана карыстацца знойдзенай інфармацыяй. Адзначым, што наяўнасць дзвюх версій Вікіпедыі – сур’ёзнае дасягненне для ўсёй нацыянальнай беларускай мовы. Гэта сведчыць пра неабыякавасць яе носьбітаў, а таксама пра жаданне карыстацца тытульнай мовай і ў прафесійнай дзейнасці.